*(Далей дзеці гуляюць у прапанаваную ім беларускую народную гульню).*

**Выхавальнік:** А зараз паслухайце, калі ласка, верш яшчэ аб адным вырабе з гліны, які называецца збанок.

Сеў за кола ганчар,
З гліны выкруціў шар,
Горла. Вушка прырабіў.
Ўсе ў печы абпаліў.
І глядзіце: ужо гатовы
Залаты збаночак новы.

Г.Багданава

**Выхавальнік:** А цяпер, давайце паспрабуем з вамі выляпіць з цеста збанкі. Але спачатку нам патрэбна пераўтварыцца ў маленькіх ганчароў.

*(Дзеці пад беларускую народную музыку апранаюць фартухі, затым выхавальнік паказвае як паступова патрэбна ляпіць збанок, пасля дзеці лепяць вырабы самастойна. Пасля заканчэння самастойнай работы дзяцей выхавальнік робіць выставу іх вырабаў).*

**Выхавальнік:** Дзеці, вы сёння працавалі як сапраўдныя майстры. Ёсць такая прыказка: Справа майстра баіцца. Як вы яе разумееце? *(Адказы дзяцей)* .

**Выхавальнік:** Так, сапраўды, калі чалавек бярэцца за якую – небудзь справу са стараннем, то ў яго абавязкова ўсё атрымаецца. Спадзяюся, вам сёння было цікава.

Літаратура:

1. Дубініна, Д.М. Культура Беларусі ў казках і паданнях: этнакультурная адукацыя дашкольнікаў: дапам. для педагогаў установ дашк. адукацыі / Д.М.Дубініна, Д.У.Дубінін. – Мінск: Зорны верасень, 2008.
2. Дубініна, Д.М. Мая родная старонка: дапам. для педагогаў установ дашк. адукацыі / Д.М.Дубініна, Д.У.Дубінін. – Мінск: Полымя, 2016.
3. Красіла, А. І. Мой край завецца Беларуссю : дапам. для педагогаў установ дашк. адукацыі / А. І. Красіла. – Мазыр: Белы Вецер, 2008.

## Канспект занятка па адуацыйным абласцям “Дзіця і грамадства”, “Дзіця и грамадства”, “Мастацтва. Дзіцячы дызайн” для выхаванцаў старэйшай групы

*Бурміч Святлана Мікалаеўна,*
*выхавальнік дашкольнай адукацыі*
*ДУА “Дашкольны цэнтр развицця дзіцяці г.Петрыкава”*

**Мэта:** фармірававаць уяўленні дзяцей пра асаблівасці нацыянальнай культуры; узбагачаць веды дзяцей аб беларускіх прадметах побыбу (посуд, вышытыя вырабы, вырабы з саломы, лазы, дрэва); развіваць цікавасць да нацыянальных традыцый; выхоўваць павагу да культурных традыцый беларускага народа.

**Матэрыял і абсталяванне:** памяшканне аформленае ў народным стылі мінулага; вырабы з гліны, дрэва, лазы, саломы, вышытыя і тканыя вырабы; нацыянальнае адзенне для выхавальніка, музычнае суправаджэнне (беларускія народныя мелодыі); папяровыя сурвэткі і іголкі для вышывання; качалкі, прас, ільняныя ручнікі, падушачка для гульні.

### Ход занятка

*(Дзеці заходзяць у музычную залу пад беларусскую народную мелодыю, дзе іх сустракае выхавальнік у беларускім нацыянальным строі).*

**Цётка Васіліна:** Добры дзень, дзеці! Якія вы ўсе прыгожыя. Давайце з вамі пазнаёмімся. Мяне завуць цётка Васіліна. А як вас завуць? *(Адказы дзяцей).*

**Цётка Васіліна:** Я так задаволена, што вы да мяне прыйшлі. А ці жадаеце вы хоць на некалькі хвілін апынуцца ў мінулым і пабачыць якімі рэчамі карысталіся нашы продкі, што ўмелі рабіць? *(Адказы дзяцей).*

**Цётка Васіліна:** Напэўна вы ўжо ведаеце, што мы, беларусы, народ працавіты, і калі вы хочаце шмат чаго даведацца вам патрэбна будзе крышачку папрацаваць разам са мною. Ці згодны вы на гэта? (Адказы дзяцей.)

**Цётка Васіліна:** Тады я запрашаю вас да сябе ў госці! Праходзьце, калі ласка ў хату!

*(Дзеці праходзяць у залу).*

**Цётка Васіліна:** Вы ведаеце, мае даражэнькія, у мяне есць шмат цікавых рэчаў. Я якраз збіралася іх раставіць на палічкі, каб у хаце быў парадак. Можа вы мне дапаможаце? *(Адказы дзяцей)* .

**Цётка Васіліна:** Ёсць тут вырабы з гліны, саломы, лыка, лазы, дрэва, А ці ведаеце вы як называлі майстроў, якія рабілі ўсе гэтыя рэчы? *(Адказы дзяцей).*

**Цётка Васіліна**: Давайце я вам крышачку раскажу тое, што ведаю сама. Майстроў, якія выраблялі драўляныя рэчы – дзежкі, бочкі, посуд для хатняй гаспадаркі называлі бондары. Цяпер гэтымі вырабамі часцей карыстаюцца на вёсцы, іх можна ўбачыць у краязнаўчых музеях. Драўляны посуд выраблялі з дубу, сасны, асіны, елкі. Яшчэ майстроў, якія рабілі драўляны посуд: лыжкі, міскі, каўшы называлі суднікі. З дрэва рабілі і цацкі для дзяцей. Вось, паглядзіце, у мяне таксама ёсць некалькі вырабаў з дрэва. (Кадушка для захоўвання гародніны альбо грыбоў, лыжка, дудачка.)

**Цётка Васіліна:** Вырабы з гліны выконвалі ганчары. Для гатавання гарачых страў рабілі гаршкі. Для малака і малочных прадуктаў прызначаліся гарлачы. Для малака яшчэ выкарыстоўвалі збанкі, але яны выдзяляліся дзюбкай і вушкам – ручкай. У гляках захоўвалі ваду, алей.

**Цётка Васіліна:** На Беларусі выраблялі плецены рэчы з лазы, саломы, лыка. З лазы рабілі мэблю, кошыкі, цукерніцы, з саломы плялі, цацкі, капялюшы, сурвэткі. З лыка плялі лапці. У мяне таксама ёсць выраб з лазы, вось гэта цукерніца, з саломы сурвэтка, з лыка – лапці.

**Цётка Васіліна:** А зараз давайце разам з вамі паставім усе гэтыя рэчы на палічкі. Плецены вырабы патрэбна пакласці на верхнюю палічку. Вам патрэбна выбраць плецены выраб і, калі можаце, назавіце яго.

*(Дзеці выбіраюць плецены рэчы).*

**Цётка Васіліна:** Вырабаў з гліны мы паставім на сярэднюю палічку. *(Дзеці выбіраюць гліняныя вырабы).*

**Цётка Васіліна:** Вырабы з дрэва давайце паставім на ніжнюю палічку.

*(Дзеці ставяць драўляныя рэчы).*

**Цётка Васіліна:** Якія вы малайцы, дапамаглі мне навесці прыгажосць у хаце. Бачу, стаміліся вы ўжо стаяць праходзьце і сядайце.

*(Дзеці сядаюць).*

**Цётка Васіліна:** А ці звярнулі вы ўвагу ў якое адзенне я апранута? *(Адказы дзяцей).*

**Цётка Васіліна:** Так, сапраўды, гэта жаночы беларускі народны касцюм. А ці ведаеце вы, як называюцца рэчы па асобку?

**Дзеці:** Кашуля, андарак, фартух.

**Цётка Васіліна:** Як вы лічыце, дзе ж нашы продкі бралі сабе такое адзенне? *(Адказы дзяцей).*

**Цётка Васіліна:** Так, сапраўды, нашы продкі рабілі яго самі з ільну, бавоўны. Раней на Беларусі было распаўсюджана ткацтва. Ткалі палатно, ручнікі, посцілкі. А для того, каб адзенне і іншыя рэчы былі прыгажэйшыя іх ўпрыгожвалі вышыўкай. Вось, паглядзіце, у мяне тут ёсць вышытая сурвэтка, ручнік, абрус.

**Цётка Васіліна:** Дзеткі, а якога колеру мая кашуля?

**Дзеці:** Белага.

**Цётка Васіліна**: А ці ведаеце вы, чаму беларусы любяць вопратку белага колеру? Што ён можа азначаць?

**Дзеці:** Чысціню, дабрыню людзей.

**Цётка Васіліна:** Арнамент бывае розны: гэта і прамыя лініі і крыжыкі, квадраты, ромбы, кветкі. І ўсе гэта называецца вышыўка.Ці ведаеце вы, што азначае чырвоны колер у беларускім арнаменце?

**Дзеці:** Ён азначае жыццё, радасць, вяселле.

**Цётка Васіліна:** Што азначае чорны колер у арнаменце?

**Дзеці:**Гора, смутак

**Цётка Васіліна:** А ці хочаце вы крышачку навучыцца вышываць? (Адказы дзяцей.) Тады бярыце на стале іголачкі ды сурвэтачкі, а я вам пакажу як можна вышываць крыжыкам.

*(Самастойная праца дзяцей пасля паказу ўзору выхавальнікам ).*

**Цётка Васіліна:** Ці спадабалася вам вышываць? *(Адказы дзяцей).*

**Цётка Васіліна:** Ой, мае дзетачкі, я бачу вы ўжо крышачку стаміліся, а ці любіце вы гуляць? (Адказы дзяцей.)

**Цётка Васіліна:** Тады я прапаную вам пагуляць у беларускую народную гульню "Падушачка" - адзін з самых распаўсюджаных старадаўніх карагодаў.

*Гулнья "Падушачка".*

**Цётка Васіліна:** Ці спадабалася вам гуляць? *(Адказы дзяцей).*

**Цётка Васіліна:** У мяне для вас ёсць яшчэ адзін вельмі цікавы занятах, падыходзьце да стала.

*(Дзеці падыходзяць і становяцца вакол стала на якім стаіць маслабойка).*

**Цётка Васіліна:** Вось гэта маслабойка, зараз я вам пакажу, як раней вашы бабулі збівалі масла. А цяпер вы паспрабуйце.

*(Дзеці пад музыку збіваюць масла).*

**Цётка Васіліна:** Ой, дзеткі, я ж зусім забылася, мне ж яшчэ рэчы трэба, папрасаваць! Дапаможаце мне? *(Адказы дзяцей).*

*(Дзецям прапануецца пазнаёміцца з прыладамі для прасавання бялізны: палкі - качалкі, прас і паспрабаваць папрасаваць ручнік і сурвэтку).*

**Цётка Васіліна:** Ну, што, мае даражэнькія, ці спадабалася вам у мяне ў гасцях? *(Адказы дзяцей).*

**Цётка Васіліна:** А што вам спадабалася больш за ўсё? (Адказы дзяцей.) З

**Цётка Васіліна:** Хачу пажадаць вам, каб вы ніколі не забывалі пра нашу багатую нацыянальную спадчыну і ганарыліся тым, што вы жывеце ў Беларусі. Да пабачэння!

Літаратура:

Дубініна, Д.М. Мая родная старонка: дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі / Д.М.Дубініна, Д.У.Дубінін. – Мінск: Полымя, 2016.

**Канспект свята**
**для выхаванцаў старэйшай групы**

*Белая Тамара Ўладзіміраўна,*
*выхавальнік дашкольнай адукацыі*
*ДУА “Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці г.Петрыкава”*

**Тэма: На нашым кірмашы ўсё ад душы**

**Мэта:** Узбагачаць ўяўленні аб роднай Беларусі, фарміраваць цікавасць да нацыянальных традыцый і звычаяў беларускага народа, абагульняць і замацоўваць веды дзяцей пра беларускае дэкаратыўна –ужытковае мастацтва, узбагачаць дзіцячы рэпертуар новымі беларускімі і народнымі спевамі, танцамі, гульнямі.

**Матэрыял і абсталяванне:** інтэр’ер беларускай сялянскай хаты, беларускія тканыя ручнікі, вырабы з саломкі, стол з гліняным посудам (гарлачык, талеркі, кубкі, спарыш, гляк, гаршок), агародніна і садавіна.

**Ход мерапрыемства**

*Уваходзяць Баба Еўка і Дзед Тамаш.*

**Баба:** Ой, колькі народу сабралася! Добры дзень, даражэнькія!

**Дзед:** Добрага здароўечка!

**Баба**: А якая прыгажосць кругом! Дзядуля, гукай Аленку.

**Дзед:** Алёнушка, хутчэй сюды!

*Выходзіць Алёнка.*

**Аленка:** Бабулечка, дзядулечка, як тут хораша. Кірмаш пачынаецца?

**Баба:** Так, унучачка, так, усім хочацца на кірмашы пабываць, песянкі заспяваць, ласункаў адведаць.

**Аленка:** Тады я сяброў паклічу!

**Дзед:** Пакліч. пакліч, унучачка! Разам лепей і спяваць, і гандляваць.

**Аленка:** Гэй, сябры. сяброўвачкі!

Гэй, Гэй, Гэй!

Хуценька бяжыце, на кірмаш спяшыце!

*(Уваходзяць дзец, вітаюцца)*

**Баба:** А ці ведаеце вы дзеці, што такое кірмаш?

*(Адказы дзяцей).*

**Дзед:** Кірмаш – гэта святочны гандль, дзе народныя ўмельцы прадаюць свае вырабы. На Беларусі здаўна жывуць добрыя, працавітыя людзі, якія любяць сваю зямлю, шчыра працуюць. І таму вырабы нашых беларускіх майстроў вядомы ва ўсім свеце. Кірмаш – таксама гульні. танцы. песні і жарты. Абавязкова ласункі Зараз ужо будзеце ведаць, што такое кірмаш? Ну і добра!Запрашаю ўсіх на кірмаш!

*Беларуская гульня “Бабка Еўка, дзед Талаш”*

**Баба:** Дзеці, сюды! У гэтага гандляра бачыце, якая прыгажосць! Цудоўны посуд з гліны.

**Гандляр:** Мы былі на гліншчы,

Бралі гліну ў прыгаршчы.

Шмат на лаўку нанасілі,

Замяшалі, замясілі,
Наляпілі гладышоў,
Місак, сподкаў, спарышоў.
Сохне посуд на двары,
Хіба ж мы не ганчары?
Ды не працавітыя?
Усе лаўкі і сталы
Посудам укрытыя!
Падбягайце і купляйце!
**Баба:** Гліна звонкая, гліна тонкая!
З глінянай міскі – ежа смачная!

**Дзед:** И сапраўды самая смачная и халодная вада ў гліняным гладышы. А малако і смятана лепш за ўсё захоўваюцца ў гліняных гаршочках. А якая смачная бульба і каша, запечаная ў гліняным гаршэчку! Усе каштавали? Смачна?

**Баба:** На Беларусі шмат ёсць месцаў, дзе знаходзіцца гліна. Беларускія вырабы з гліны звычайна карычневага колеру, цёмныя або светлыя. І ўпрыгожаны беларускім узорам- тонкімі ці шырокімі лініямі , ці кропачкамі.

*(Паказвае посуд).*

**Дзед:** Дзеці, ці ведаеце вы, як завецца гэты посуд?
**Дзеці:** Гладыш. гляк. міска. кубак, сподак.
**Баба:** Шаноўна гаспадар!
Мы тавар жадаем набыць
Толькі вось не ведаем
Чым табе плаціць?
**Гандляр:** Я з вас багата не вазьму
За посуд папрашу з вас гульню,
Але гульня гэтая розніца –
У “Гарлачык” пагуляць возьмецеся?
**Баба:** Калі ласка, гаспадар,
У “Гарлачык” гуляць гатовы.
Хуценька, мае дзеткі,
Станавіцеся ў кола!

*Гульня “Гарлачык”*

**Гандляр:** Малайцы, дзеткі. душу павесялілі.
Бярыце ў падарунак цацку- свістульку.
**Баба:** Пойдзем далей. Глядзіце! Вось дык прыгажосць!
Шаноўны гандляр, што гэта ў вас?
**Гандляр:** Не хавайце сваіх грошай,
Потым пашкадуеце, калі лёну і саломкі
Для сябе не купіце.
Лён з саломкаю заўжды
У Беларусіі дружны.
Падыходзьце хутчэй!
Пазнаёмлю з кветкамі –
З саломкай залатой, вось такой!

**Баба:** Падабаюцца вам вырабы з саломкі?

*(Адказы дзяцей).*

**Гандляр:** Што, жадаеце набыць?

**Баба:** Колькі каштуе ваш тавар?

**Гандляр:** Хто раскажа прымаўкі, той і будзе тавар выбіраць!

**Дзед:** Дзеці, зірніце сюды! Як вы думаеце, з чаго зроблены гэтыя дзіўныя рэчы?

**Дзеці:** З ільну.

**Баба:** Так, дзеткі, так. Гэта лён. Паглядзіце! Як вы думаеце, працаваць з ільном цяжка?

**Дзіця:** А мы сеялі лянок,
Урадзіўся наш лянок.
Мы лянок ірвалі,
У снапы збіралі,
Аббівалі, у полі слалі.
Урадзіўся лянок,
Белы, слаўны кужалёк.
з кужалька зрабілі цацкі.

**Дзед:** Вось здзівілі, так здзівілі.
Вы пра лён усе гаварылі.
Мы з яго кашулі шыем

**Дзеці:** А мы песенькі пяём!

**Баба:** Калі хочаш што ўзяць –
Трэба песню праспяваць

*Карагод " У карагодзе мы былі"*

**Дзед:** Бабуля, ці не падыйсці нам да вось гэтай смакаты?
Што нам трэба набыць самае галоўнае?

**Баба:** Як што? Бульбу! Гэй, у каго тут бульба ёсць?

**Дзед:** Зараз убачыце, якую добрую бульбу вырасціла наша гаспадыня.

*Пляска "Бульба"*

**Дзед:** Добрая бульба, сып у кошык, ды паболей!

**Баба:** Вось і добра. Цяпер нам патрэбна яшчэ якой-небудзь агародніны ці садавіны.

**Гандляр:** Паглядзіце, якія у нас яблыкі, грушы. А якія смачныя!

**Баба:** Хочам ваш тавар набыць. колькі ён каштуе?

**Гандляр:** Не ў грошах шчасце,
А калі радасць ды вяселле ў хаце.
А кожная садавіна будзе твая,
калі загадка аб ёй адгаданая.

*(Гандляр дарыць карзіну з ласункамі).*

**Баба:** Надыходзіць сумны час,
Пара развітацца.
Але просім шчыра Вас,
Зноў да нас вяртацца!

**Дзед:** Будзем рады мы сябрам,
Пачастуем ласкай.

Няхай сонца свеціць вам, Як у добрай казцы!
**Баба:** Хоць шкада, але ж бывайце!
**Дзед:** Толькі нас не забывайце!

## План-канспект майстар-класа

*Бурміч Святлана Мікалаеўна,*
*выхавальнік дашкольнай адукацыі*
*ДУА"Дашкольны цэнтр*
*развіцця дзіцяці г.Петрыкава"*

**Тэма: "Выразныя сродкі этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту"**

**Мэта:** павышэнне прафесійнага майстэрства ўдзельнікаў майстар-класа праз выкарыстанне выразных сродкаў этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту.

**Задачы:** актывізаваць веды ўдзельнікаў па тэме майстар-класа; стварыць умовы для фарміравання матывацыйнай гатоўнасці ўдзельнікаў майстар-класа да азнакамлення з прыёмамі і сродкамі, спрыяючых этнакультурнаму выхаванню дзяцей дашкольнага ўзросту; садзейнічаць усведамленню ўдзельнікамі важнасці атрыманага вопыту на дадзеным майстар-класе.

**Абсталяванне:** кветкі па колькасці ўдзельнікаў, загадкі, песні, легенды на кожную групу ўдзельнікаў, алоўкі, беларускія народныя музычныя інструменты, салёнае цеста для лепкі, кавалкі тканіны і чырвоных стужак на кожнага ўдзельніка, жаночы беларускі народны касцюм для вядучага.

### Ход майстар-класа

*(Пад музычнае суправаджэнне ўдзельнікаў майстар-класа сустракае вядучы ў беларускім народным касцюме з кветкамі.)*

**Вядучы:** Добрай раніцы! Вельмі рада нашай сустрэчы. Выбярыце, калі ласка, кветку якая вам спадабаецца. Паважаныя ўдзельнікі майстар-класа, дазвольце яшчэ раз усіх вас павітаць. Завуць мяне Бурміч Святлана Мікалаеўна. Працую я выхавальнікам дзяржаўнай установы "Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці горада Петрыкава." Перад тым, як абвясціць тэму нашага майстар-класа, мне б хацелася паслухаць вашы меркаванні наконт таго, пра што можа ісці наша гаворка.

*(Удельнікі выказваюць сваю думку).*

**Вядучы:** Дзякуй за вашы адказы. Важнае месца ў сваёй працы я адвожу этнакультурнаму выхаванню дзяцей дашкольнага ўзросту, менавіта таму сёння я пазнаёмлю вас з выразнымі сродкамі этнакультурнага выхавання. Прынцып якога я буду сёння прытрымлівацца: "Я ведаю як гэта зрабіць і навучу вас." Перад тым як зайсці ў аўдыторыю кожны з вас выбраў кветку.
Зараз я папрашу вас падзяліцца на групы ў залежнасці ад таго, якую кветку вы выбралі.

*(20 удзельнікаў дзеляцца на 4 групы: "Званочкі", "Васількі", "Макі", "Рамонкі".)*

**Вядучы:** Для таго, каб нашы зносіны былі больш прыемнымі, я папрашу вас напісаць імя, якім я магу да вас звяртацца.

*(Удзельнікі пішуць свае імёны).*

**Вядучы:** Нам з вамі пашанцавала, таму што нашы продкі пакінулі скарб, якінам нават не патрэбна шукаць, а толькі ўмела выкарыстоўваць. Сёння я прапаную вам успомніць некаторыя багацці беларускага народа. У мяне ёсць вось такая цудоўная шкатулка, а ў ёй мяшочкі з назвамі, якія дапамогуць нам з вамі пабудаваць нашу працу на майстар-класе так, каб усё тое, што вы ўбачыце і пачуеце было для вас цікавым,займальным і карысным. На працягу ўсёй нашай сустрэчы будзе працаваць умоўны знак – паднятая кветка. Ён будзе сведчыць аб тым, што што група падрыхтавалася, альбо ў вас узнікла нейкае пытанне. А цяпер,паважаныя, дазвольце пачынаць.

*(Далей майстар-клас ідзе ў парадку, які задаюць самі ўдзельнікі. Перад кожным заданнем вядучы робіць невялікі ўступ).*

**Загадкі.**

- **Вядучы:** Выкарыстанне загадак з'яўляецца адным з цікавых і дзейсных метадаў работы па этнакультурнаму выхаванню дзяцей. Народныя загадкі адрозніваюцца яркай вобразнасцю. Загадка патрабуе разважання, мабілізацыі ведаў для рашэння праблемы, гэта значыць, развівае ў дзіцяці здагадлівасць і кемлівасць.

*(Далей кожная група па чарзе выцягвае з мяшочка па дзве загадкі. На абмеркаванне адной загадкі даецца 30 секунд).*

Каля носа ўецца – а ў рукі не даецца. *(Вецер).*
Ішоў даўгавяз, у зямлю ўвяз. (Дождж)
Рук многа, а нага адна. *(Дрэва).*
Сіняя дзяружка ўвесь свет накрыла.*(Неба).*
Зялёная, а не луг, белая,а не снег,
Кучаравая, а без валасоў. *(Бяроза).*
Усіх нас корміць, а сама есці не просіць. *(Зямля).*
Было жоўтым, вырасла зялёным,
сонца пацалавала, зноў жоўтым стала. *(Жыта).*
З барадою, а не дзед, з рагамі, а не бык,
малако дае, а не карова, лыка дзярэ,а лапці не пляце. *(Каза).*

**Паданні і легенды.**

**Вядучы:** Паданні і легенды з'яўляюцца захавальнікамі гістарычнай памяці народа. Легенда – гэта спалучэнне звычайнага і дзівоснага. Што да паданняў, то асновай іх сюжэтаў звычайна служаць гістарычныя падзеі. У вас на сталах ляжаць жоўтыя лісты, а на іх урыўкі з легенд і паданняў. Насупраць назвы, але яны пераблытаны. Патрэбна знайсці кожнаму ўрыўку адпаведную назву і злучыць іх. На гэта вам даецца адна хвіліна.

| | |
|---|---|
| Як паляцелі птушкі: адна ў адзін бок, другая ў другі… Як пабеглі сабакі за птушкамі, дык ажно зямля закурылася… Як пайшлі тыя сабакі, дык і да | |

| | |
|---|---|
| гэтага часу не вярнуліся, а па іх слядах дзве рэчкі працягнуліся, у адзін бок прайшла Дзвіна, а ў другі бок – Дняпро. Вось у гэтых абшарах Белаполь і пачаў сяліцца ды заводзіць свае лады… У Белаполя ад розных жонак яго развяліся розныя племення пад прозвішчам Беларусы. Яны і да гэтага часу там ходзяць, зямельку скарагодзяць, ды жыта сеюць… | “АДКУЛЬ ПАЙШОЎ ГОМЕЛЬ” |
| Там, дзе цяпер стаіць гэты горад, пасярэдзіне ракі Сож некалі было намыта шмат пяску. Каб плыты і баркі, што плылі па рацэ, не ўзбіраліся на мель. На беразе, каля гэтага месца заўсёды стаяў чалавек… | “АДКУЛЬ УЗЯЎСЯ МЯДЗВЕДЗЬ” |
| Даўно тое здарылася. Людзей тады было мала. Гэта цяпер так народу намножылася, што ледзь зямля іх падымае. А даўней людзі жылі сям-там па лесе, лавілі звера, птушак, а ў азёрах ды рэках – рыбу. Улетку збіралі ягады або капалі карэнне, рабілі запасы на зіму, больш за ўсё запасалі арэхаў і мёду… | “ЧОРНЫ БУСЕЛ” |
| І хоць таго нядобрага чалавека даўно няма на свеце, птушкі ніяк не могуць забыцца пра сваю крыўду і кожны год стараной аблятаюць людскія паселішчы. Праўда, іншы раз чорны бусел світанкам прылятае на нёманскі плёс, заходзіць па калені ў цёплую ваду і з тугой паглядае на срэхі хат… | “АДКУЛЬ ПАЙШЛІ БЕЛАРУСЫ” |

**Беларускія народныя гульні.**

**Вядучы:** У сваёй педагагічнай дзейнасці я заўсёды выкарыстоўваю беларускія народныя гульні. Менавіта народная гульня заўсёлы выкарыстоўвалася з мэтай выхавання падрастаючага пакалення. Народныя гульні таксама выклікаюць актыўнасць думкі, спрыяюць пашырэнню далягляду. Адметнасць беларускіх народных гульняў – сувязь рухаў са словамі, высокая эмацыянальная насычанасць.

*Удзельнікам майстар-класа прапануецца беларуская народная гульня “Прэла-гарэла”. Удзельнікі прагаворваюць словы:*

*Прэла-гарэла за мора ляцела,*
*А як прыляцела, дзе небудзь села.*
*Хто першы знойдзе, той сабе возьме.*

*Пасля гэтага патрэбна знайсці вырабы з цеста, якія былі схаваны да пачатку сустрэчы. Колькасць вырабаў 5-6.*

**Заняткі.**

**Вядучы:** Як вы лічыце, паважаныя, чым займаліся нашы продкі ў вольны адпрацы час?

*(Адказы ўдзльнікаў ).*

**Вядучы:** Заняткаў было шмат, і адным з улюбленых заняткаў беларускіх жанчын быў выраб лялек для сваіх дзяцей. Ці даводзілася вам рабіць беларускіх лялек? Зараз я пакажу вам, як можна зрабіць самую простую ляльку “Пелянашку”.

*(Вядучы паказвае паслядоўнасць вырабу填 лялькі з адначасовым паясненнем)*

**Беларускія народныя песні.**

**Вядучы:** Беларуская народная песня раней гучала амаль што з кожнай хаты. Усе святы абавязкова суправаджаліся спяваннем беларускіх народных песен.

*(Удзельнікам прапануецца скласці радкі песен у правільным парадку, каб атрымаўся урывак з вядомых беларускіх народных песен: “Ох і сеяла Ульяніца лянок”, “Зайграй жа мне, дударочку”, “Купалінка”, “ Касіў Ясь канюшыну”.На выкананне заданне адводзіцца 1 хвіліна).*

Зайгра жа мне, дударочку,
Як сам разумееш.
Зайграй сівы галубочак, тое што ўмееш.
Тум - тум, тум-та, тум-та, як сам разумееш,
Тум - тум, тум-та, тум-та тое што ўмееш.

Ох, і сеяла Ульяніца лянок!
Ох, і сеяла Іванаўна лянок!
Ох, сэрца лянок, мая радасць ты, лянок,
Усё бялюсенькі кужалёк!

Купалінка, Купалінка, цёмная ночка,
Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка?
Мая дочка ў садочку, ружу, ружу поліць,
Ружу, ружу поліць белы ручкі коліць!
Ружу, ружу поліць белы ручкі коліць!

Касіў Ясь канюшыну, касіў Ясь канюшыну,
Касіў Ясь канюшыну, паглядаў на дзяўчыну!
А дзяўчына жыта жала, а дзяўчына жыта жала,
А дзяўчына жыта жала, ды на Яся паглядала!

**Рамёствы.**

**Вядучы**: Якімі рамёствамі, на вашу думку, займаліся нашы продкі? (Адказы ўдзельнікаў).

**Вядучы:** Займаліся яны пляценнем, вышывалі, ткалі, кавалі, займаліся ганчарствам. Пры знаёмстве дзяцей з рамяством ганчара ва ўмовах дзіцячага саду, для большай зручнасці гліну можна замяніць на цеста для лепкі.

*(Вядучы паказвае ўзор выканання лепкі, пасля чаго ўдзельнікі робяць выраб па свайму жаданню. На выкананне задання адводзіцца дзве хвіліны.)*

**Вядучы**: На працягу ўсяго майстар-класа мы з вамі адчынялі для сябе скарбы беларускага народу. А зараз, я б хацела сабраць наш з вамі скарб. У вас на сталах ёсць жоўтыя канверты, а ў іх сказы, якія патрэбна прадоўжыць. Усе вашыя думкі, з вашага дазвалення я збяру ў саламяную шкатулку, таму што

наша сустрэча і гэтыя адчуванні, эмоцыі, для мяне з'яўляюцца маім невялічкім скарбам, які б я хацела захаваць.

*(Сказы: Мне захацелася…. Асабліва было цікава…. Цяпер я магу…. У канцы 4-5 удзельнікаў прагаворваюць свае думкі).*

**Вядучы:**На гэтым наш майстар-клас скончаны. Спадзяюся, час які мы з вамі правялі разам не прайшоў марна. Вялікі дзякуй вам за ваш добры настрой, за вашы ўсмешкі. Мне было вельмі прыемна з вамі працаваць. Жадаю вам поспехаў і ўсяго самага найлепшага. Дзякуй за ўвагу!

Літаратура:

1.Дубініна , Д.У., Родная прырода ў вуснай народнай творчасці:
дапам. для педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі/Д.М.Дубініна, А.А.Страха, Д.У.Дубінін.- Мінск: Нац. інстытут адукацыі, 2016.